# ЯДВІГА ІВАНАЎНА АНОШКА
# (ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)



18 кастрычніка 2023 г. споўнілася 80 гадоў Ядвізе Іванаўне Аношцы – вядомаму беларускаму геолагу, кандыдату геолага-мінералагічных навук, дацэнту.

Я. І. Аношка нарадзілася ў г. п. Іўе Гродзенскай вобласці. У 1958 г. яна скончыла Іўеўскую СШ № 2 з залатым медалём і затым атрымала вышэйшую адукацыю на геаграфічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна (1958–1963). Пачала працоўны шлях у 1962 г. у Інстытуце глебазнаўства Мінсельгаса БССР на пасадзе інжынера-глебазнаўцы, затым працавала ў Мінскай занальнай аграхімічнай лабараторыі Мінсельгаса БССР аграхімікам (1965–1968) і кіраўніком групы глебазнаўцаў (1968–1970).

У 1970 г. Ядвіга Іванаўна перайшла ў Лабараторыю геахімічных праблем АН БССР на пасаду старшага інжынера ў сектар геахіміі гіпергенезу і асадачнага літагенезу. На базе гэтай лабараторыі і Плешчаніцкай геафізічнай абсерваторыі ў 1971 г. быў утвораны Інстытут геахіміі і геафізікі АН БССР, з якім і быў далей цесна звязаны яе лёс. Я. І. Аношка хутка стала прызнаным спецыялістам у галіне літалогіі, мінералогіі і геахіміі асадкавых парод. У 1983 г. яна паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю «Мінеральны састаў і ўмовы фарміравання кантынентальных палеаген-неагенавых адкладаў Беларусі». Навуковыя вынікі, атрыманыя Я. І. Аношкай, у далейшым былі выкарыстаны пры геалагічным карціраванні, у тэматычных працах з мэтай ацэнкі перспектыў комплекснага выкарыстання адкладаў і пошукаў карысных выкапняў, для стратыграфічнага расчлянення і карэляцыі, пры палеагеаграфічных рэканструкцыях.

З 1989 г. Ядвіга Іванаўна займала адміністрацыйныя пасады. Яна працавала вучоным сакратаром, затым – намеснікам дырэктара па навуковай працы акадэмічнага Інстытута геахіміі і геафізікі (1993–2008), у сакавіку – жніўні 2008 г. выконвала абавязкі дырэктара. Пасля рэарганізацыі інстытута яна была намеснікам дырэктара па навуковай працы Беларускага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь (2008–2009).

Я. І. Аношка апублікавала каля 240 навуковых прац, у ліку якіх шэраг манаграфій і вучэбных дапаможнікаў. Яна паспяхова вяла педагагічную дзейнасць – з 2001 па 2013 г. выкладала на факультэце міжнародных адносін Белдзяржуніверсітэта.

Ядвіга Іванаўна была сакратаром Дзяржаўнага савета па пытаннях выкарастыння нетраў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, членам Міжнароднай камісіі па гісторыі геалагічных навук (INHIGEO), адказным сакратаром навуковага часопіса «Літасфера», членам рэдкалегіі міжведамаснага бюлетэня «Прыродныя рэсурсы», шматлікіх камісій па розных навукова-арганізацыйных пытаннях. Арганізатарскі талент Ядвігі Іванаўны даў таксама вялікі плён пры правядзенні шматлікіх навуковых форумаў.

За высокія дасягненні ў навуковай і навукова-арганізацыйнай працы Я. І. Аношка мае шматлікія ўзнагароды.

Ядвіга Іванаўна – надзвычай адказны, працавіты, справядлівы і добразычлівы чалавек. Юбілей – гэта свята мудрасці і багатага жыццёвага вопыту. Шаноўная Ядвіга Іванаўна, зычым Вам здароўя, шчасця і дабрабыту! Няхай кожны дзень Вашага жыцця будзе напоўнены аптымізмам, гармоніяй і любоўю!

*Р. Г. Гарэцкі, А. В. Мацвееў, А. А. Махнач, рэдкалегія*